11. Шамякин И., Коваленко В. Постигать современность, думать о будущем: [Интервью] // Неман. 1981. № 1. С. 174–182.

12. Шамякин И. «С народом живу и с народом страдаю»: [Интервью с народным писателем] // Семь дней. 1996. 20 января.

13. Шамякін І., Масляніцына Т. «Чалавеканенавіснік не напіша нічога сур’ёзнага»: [Гутарка з пісьменнікам] // Народная газета. 2001. 20 студз.

14. Шурховецкий В. Боль народа была его болью: [Об общественной деятельности И. Шамякина] // Во славу Родины. 2004. 19 октября.

# ТВОРЧАЯ СПАДЧЫНА ІВАНА ШАМЯКІНА ВА ЎСПРЫМАННІ ШКОЛЬНІКАЎ

**В. Ю. Дылеўская**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. К. Маркса, 31, 220050, Мінск, Беларусь,*
*valentinadylevskaja42@gmail.com*

Артыкул прысвечаны асаблівасцям разгляду творчай спадчыны народнага пісьменніка БССР Івана Шамякіна ў 10 і 11 класах устаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Адзначана, што пры вывучэнні жыццёвага і творчага шляху пісьменніка настаўнік ставіць на мэце раскрыць асобу аўтара, асаблівасць мастацкага свету, паказаць духоўную біяграфію творцы, якая напаўняе змест яго твораў. Прыводзяцца метадычныя рэкамендацыі па выкарыстанні пэўных відаў і форм работы на занятку.

***Ключавыя словы***: Іван Шамякін; творчая спадчына; метады праверкі ведаў; тэставыя заданні; прэзентацыя.

Творчасць народнага пісьменніка БССР Івана Пятровіча Шамякіна ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі вывучаецца ў 10-м і ў 11-м класах. Вучэбнай праграмай па беларускай літаратуры 10-га класа прадугледжана знаёмства з яго творчасцю ў аглядавай тэме «Беларуская літаратура пасляваеннага дзесяцігоддзя (1945–1955 гг.)» (1 гадзіна). Патрэбна спыніцца на патрыятычным і жыццялюбным пафасе творчасці, абумоўленым заканчэннем вайны, мірным будаўніцтве, ваеннай тэме як цэнтральнай ў літаратуры. Сярод вызначальных твораў пасляваеннага дзесяцігоддзя на маральна-этычныя тэмы праграмай рэкамендаваны апавяданні І. Мележа, Я. Брыля, А. Кулакоўскага, раманы І. Шамякіна, паэмы А. Куляшова, П. Броўкі. Для дадатковага чытання прапанаваны аповесці са зборніка «Палеская мадонна». У 11-м класе ў раздзеле «Беларуская літаратура перыяду 1966–1985 гадоў» вывучаецца манаграфічная тэма «Іван Шамякін». Вывучаецца жыццёвы і творчы шлях пісьменніка, аповесць «Непаўторная вясна» або аповесць «Гандлярка і паэт», раман «Сэрца на далоні». «Непаўторная вясна» – адна з аповесцяў з пенталогіі «Трывожнае шчасце». Вучні пазнаёмяцца з творчай задумай кнігі пра моладзь, якая прайшла праз ваенныя выпрабаванні, даведаюцца пра аўтабіяграфічныя моманты ў творы, пазнаёмяцца з галоўнымі героямі Сашай Траянавай і Пятром Шапятовічам, іх узаемаадносінамі, духоўным светам. Праграма прапануе звяртацца да твораў мастацтва, дзе вобраз пісьменніка паўстае ў жывапісе. Прапануюцца: М. Будавей, «Партрэт Івана Шамякіна»; Н. Шчасная, «Снежныя зімы (партрэт пісьменніка Шамякіна)»; У. Масленнікаў, «Мае бацькі ў маі 1945 года». З тэатральнага мастацтва: спектаклі «Трывожнае шчасце», «Сэрца на далоні», «І змоўклі птушкі». З кінамастацтва: мастацкія фільмы «Гандлярка і паэт» (рэжысёр С. Самсонаў), «Вазьму твой боль» (рэжысёр М. Пташук) [1].

Вопыт вывучэння творчасці Івана Пятровіча Шамякіна сведчыць, што вучні любяць яго творы, яны маюць магчымасць карыстацца матэрыяламі па біяграфіі пісьменніка, у тым ліку аўдыявізуальнымі сродкамі

навучання, альбомамі, крытычнымі артыкуламі і інш. Пры вывучэнні жыццёвага і творчага шляху пісьменніка настаўнік ставіць на мэце раскрыць асобу аўтара, асаблівасць мастацкага свету, паказаць духоўную біяграфію творцы, якая напаўняе змест яго твораў. Яшчэ В. Р. Бялінскі падкрэсліваў: «Прыступаючы да вывучэння…, трэба перш за ўсё ўлавіць у мностве адрозненняў і разнастайнасці яго твораў таемнасць яго асобы, гэта значыць тыя асаблівасці яго духу, якія належаць яму аднаму» [2, с. 307]. Неабходна падвесці вучняў да разумення, што біяграфія пісьменніка – паняцце не вузка асабістае, а грамадска-гістарычнае. «Ва ўсякай біяграфіі, – на думку акадэміка Д. С. Ліхачова, – прысутнічае эпоха… Стварэнне твора ёсць факт біяграфіі аўтара, біяграфія аўтара ёсць факт гісторыі, гісторыі літаратуры ў прыватнасці» [4, с. 90, с. 101]. Па сваёй сутнасці, біяграфія І. П. Шамякіна – гэта перажыванне асабістага жыцця ў гісторыі. Настаўнік можа выкарыстаць традыцыйны варыянт вывучэння, калі ў лекцыю ўключаецца характарыстыка аўтара, якую вучні фіксуюць у выглядзе тэзісаў «Летапіс жыцця і творчасці Івана Шамякіна». Другі варыянт – падрыхтаваць выступленні вучняў з кароткімі інфармацыйнымі паведамленнямі, якія дапоўняць лекцыю настаўніка. Паведамленні павінны быць падрыхтаваны па крыніцах, якія ўтрымліваюць не толькі летапіс жыцця, але і інтэрпрэтацыю творчасці. Гэта дазволіць давесці да вучняў патрэбную інфармацыю пра жыццёвы і творчы шлях І. П. Шамякіна, стаць аглядам навуковай і навукова-папулярнай літаратуры. Супастаўленне біяграфіі пісьменнніка з творчасцю з’яўляецца прадуктыўным шляхам вывучэння яго літаратурнай спадчыны.

Дзейнасць вучняў і настаўніка накіравана на атрыманне новых ведаў, на матывацыю лепшага ўспрымання вучэбнага матэрыялу і выяўлення настаўнікам ведаў вучняў. Гэта тры асноўныя фактары, якія ўваходзяць у склад навучальнага працэсу. Выяўленне ўзроўню ведаў вучняў дазваляе настаўніку выявіць, наколькі добра яны валодаюць тэмай. Каб спланаваць далейшую працу, настаўніку неабходна гэта рабіць на кожным уроку. Для

высвятлення рэальных ведаў і ўменняў вучняў па творчасці Івана Шамякіна ў час педагагічнай перaддыпломнай практыкі студэнты 5 курса спецыяльнасці «Беларуская філалогія (па напрамках)» правялі канстатуючы зрэз. У эксперыментальным даследаванні прымалі ўдзел 23 вучня 11 класаў ДУА «Сярэдняя школа № 44 г. Мінска» (В. В. Астапеня) і 12 вучняў ДУА «Качышчанская сярэдня школа» Ельскага раёна Гомельскай вобласці (С. Л. Марціновіч). Асноўная задача даследавання – выяўленне і вызначэнне ўзроўню зацікаўленасці навучэнцаў творчасцю І. П. Шамякіна пры дапамозе такіх метадаў даследавання, як назіранне і анкетаванне.

Эфектыўным метадам праверкі ведаў вучняў сталі невялікія тэставыя заданні па тэме «Шамякін» у 11-м класе. Аналіз адказаў паказаў добрыя вынікі. Амаль усе (з 35 вучняў) адказалі на пытанні. Не выклікалі цяжкасцей і пытанні, звязаныя з суаднясеннем дзеючых асоб з твораў. Задавальняе тое, што вучні добра ведаюць біяграфію І. П. Шамякна. Вынікі зрэзу пацвердзілі, што вучні ўвогуле нядрэнна валодаюць вучэбным матэрыялам па тэме ў рамках праграмы. Але для таго каб засваенне новага матэрыялу паляпшалася, настаўніку неабходна паўплываць на зацікаўленасць вучняў пэўнай тэмай, неабходна заінтрыгаваць іх, ужываць даступныя рэсурсы. Мэтазгодна выкарыстоўваць напісанне вучнямі рэфератаў, дакладаў. Гата дазволіць атрымаць новыя веды, замацаваць існуючыя. Неабходным будзе абавязкова прачытаць тэкст, скласці план; такая праца развівае навыкі работы з тэкстам і афармленнем рэферата. У дакладзе патрэбна будзе даць ацэнку меркаванням аўтара, прывесці свае аргументы. Можна прапанаваць вучням скласці крыжаванку па жыццёвай і творчай дзейнасці пісьменніка. Такая праца будзе спрыяць развіццю маўлення, пашырыць слоўнікавы запас, інтэлект. Эфектыўным метадам выкладання матэрыялу з’яўляецца прэзентацыя на ўроку: неабходна змясціць ілюстрацыі, партрэты пісьменніка, асноўныя творы, рэрадукцыі карцін, асноўныя даты жыцця і творчасці пісьменніка. Патрэбна адзначыць эфектыўнасць выкарыстання пры вывучэнні творчасці канкрэтнага пісьменіка віктарыны, дыскусіі, відэаматэрыялаў, каментар

настаўніка, самастойную пошукавую работу вучняў. Гэта паспрыяе прыцягненню ўвагі вучняў да творчай і жыццёвай дзейнасці пісьменніка.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Беларуская літаратура. V-XI класы. Вучэбная праграма для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з рускай і беларускай мовамі навучання. Мінск.: Нацыянальны інстытут адукацыі, 2017.

2. Белинский В. Г. Собр.соч.: В 9-ти т. М.: Худож. лит., 1976–1982. Т.5.

3. Бельскі А. І. Каханне, маладосць і трывогі сэрца // Трывожнае шчасце: аповесці. Мінск, 2008. С. 5–9.

4. Лихачев Д .С. Избранные работы: В 3 т. Л.: Худож.лит., 1987. Т.3.

5. Руцкая А. В. Грынько М. У. Методыка выкладання беларускай літаратуры. Мінск: Изд-во Гревцова, 2010.